# ЛЕКАВАЯ БЯСПЕКА З САЦЫЯЛЬНАЙ НАКІРАВАНАСЦЮ

## Доля айчынных прэпаратаў у аптэках павялічваецца

**Сёння доля беларускіх лекаў у аптэчнай сетцы складае каля 70 працэнтаў, у шпітальным сектары — 90 працэнтаў. Пры гэтым айчынныя прэпараты ў 2-3 разы таннейшыя за імпартныя. Беларуская фармпрамысловасць вырабляе каля 1750 найменняў лекаў, у тым ліку анкагематалагічныя. Некаторыя вытворцы да 50 % сваёй прадукцыі пастаўляюць на экспарт. Беларускія лекі можна знайсці ў 24 краінах свету. Аднак каб прысутнічаць на замежных рынках, неабходна пастаянна сачыць за якасцю прадукцыі і ўдасканальваць яе. Пра новыя распрацоўкі, запатрабаванасць у суседзяў і высокія патрабаванні да якасці, без якіх не выжыць, расказалі спецыялісты.**

### У 2-3 разы таннейшыя за імпартныя

Прамысловы выпуск фармацэўтычнай прадукцыі ў нашай краіне ажыццяўляюць 35 прадпрыемстваў усіх форм уласнасці: і дзяржаўнай, і прыватнай. Прычым дзяржаўныя прадпрыемствы забяспечваюць палову вытворчасці на рынку Беларусі і 70 працэнтаў усіх экспартных адгрузак, якія ажыццяўляе фармацэўтычная прамысловасць краіны.

Як паведаміў **генеральны дырэктар РУП «Кіруючая кампанія холдынга «Белфармпрам» Ігар МІТРАФАНАЎ,** на працягу апошніх гадоў доля беларускіх лекаў на ўнутраным рынку ў вартасным выяўленні падтрымліваецца на ўзроўні не менш як 50 працэнтаў. Гэта адзін з самых высокіх паказчыкаў у параўнанні з унутранымі рынкамі сумежных краін.

СТАР. 3

# ЛЕКАВАЯ БЯСПЕКА З САЦЫЯЛЬНАЙ НАКІРАВАНАСЦЮ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У аб'ёме спажывання ва ўмоўных упакоўках у натуральным выяўленні доля беларускіх лекаў у аптэчнай сетцы складае каля 70 працэнтаў, у шпітальным сектары — 90 працэнтаў. Гэта абумоўлена значнай, у сярэднім у 2-3 разы, розніцай у цэнах на імпартныя і айчынныя прэпараты.

Сёння ў Беларусі зарэгістравана каля 4,2 тысячы лекавых прэпаратаў, з якіх 1750 выпускаюць беларускія вытворцы. Такім чынам, айчынная фармацэўтычная прамысловасць забяспечвае лекавую бяспеку дзяржавы, што з'яўляецца адным са складнікаў яго ўстойлівага развіцця.

— Па выніках работы за 2024 год, зыходзячы з нашых прагнозаў, мы чакаем аб'ём вытворчасці фармацэўтычнай прадукцыі больш як на два мільярды рублёў з тэмпам росту 113,4 працэнта да ўзроўню 2023 года. Экспарт чакаецца каля 200 мільёнаў долараў. У рамках плана мерапрыемстваў па імпартазамяшчэнні ўсімі прадпрыемствамі будзе выпушчана імпартазамяшчальнай прадукцыі ў выглядзе лекавых прэпаратаў на суму 650 мільёнаў долараў, — расказаў Ігар Мітрафанаў.

Каб прадукцыя была запатрабавана на знешніх рынках, фармвытворцы зацікаўлены ў інвестыцыйным развіцці, мадэрнізацыі дзеючых вытворчасцяў, пляцовак. Сёння, згодна з праграмай развіцця да 2030 года, рэалізоўваюцца 22 інвестыцыйныя праекты агульным коштам звыш 900 мільёнаў. Гэта 18 праектаў у сферы вытворчай дзейнасці, тры — па мадэрнізацыі і будаўніцтве новых складскіх памяшканняў і адзін — праект па будаўніцтве лабараторыі.

Прапрацоўваецца таксама магчымасць лакалізацыі на беларускіх фармацэўтычных пляцоўках вытворчасці прэпаратаў з партфеляў замежных кампаній. На сёння вядуцца перагаворы з дзесяццю кампаніямі з Расіі, Ірана, Кітая, Кубы. У прапрацоўцы знаходзіцца не менш як 21 запатрабаваны прэпарат.

Усяго ж за апошнія пяць гадоў асвоена і зарэгістравана на рынку 429 лекавых прэпаратаў.

— Прааналізаваўшы рынак Беларусі па лекавых прэпаратах, хачу адзначыць, што ў топ-10 па продажах у натуральным выяўленні восем кампаній прадстаўлены беларускімі вытворцамі. Калі разглядзець гэтую сітуацыю з пункту гледжання топу продажаў у вартасным выяўленні, тут застаецца шэсць кампаній, — адзначыў Ігар Мітрафанаў, патлумачыўшы, што беларускія прэпараты значна таннейшыя за імпартныя.

Так, каля 50 працэнтаў наменклатуры, што выпускаецца айчыннымі прадпрыемствамі, — гэта лекавыя прэпараты коштам да 2 долараў, каля 26 працэнтаў — да 1 долара, што сведчыць аб сацыяльнай накіраванасці беларускай фармпрамысловасці.

Прадпрыемствы вядуць актыўную дзейнасць па рабоце на агульнай Еўразійскай прасторы ў адпаведнасці з новымі патрабаваннямі. У прыватнасці, у апошнія гады вытворчасці аснасцілі новым абсталяваннем для нанясення лічбавай маркіроўкі.

Ігар Мітрафанаў адзначыў, што на дзяржаўных прадпрыемствах, якія ўваходзяць у холдынг «Белфармпрам», працуе каля 7,1 тысячы чалавек, 76 % складаюць жанчыны. Усе прадпрыемствы працуюць прыбыткова і ўстойліва.

## Экспарт у 20 краін свету

Два дастаткова буйныя інвестыцыйныя праекты рэалізоўвае РУП «Белмедпрэпараты». Першы — па мадэрнізацыі вытворчасці кропель для вачэй, другі — стварэнне вытворчасці анкалагічных ліяфільна высушаных лекавых прэпаратаў. Рэалізацыя гэтых праектаў дасць магчымасць у поўнай меры задаволіць попыт на ўнутраным рынку, а таксама пашырыць геаграфію экспарту.

Адзін з найбуйнейшых айчынных фармвытворцаў выпускае і больш як 320 найменняў лекавых прэпаратаў. Агульны аб'ём вытворчасці ў год складае больш як 350 мільёнаў рублёў. Каля 40 працэнтаў ад аб'ёму выраблены прадукцыі адгружаецца на экспарт — у больш як 20 краін. Самымі буйнымі партнёрамі традыцыйна з'яўляюцца Расія, Узбекістан, Казахстан, В'етнам, Іран.

Адпаведна каля 60 працэнтаў вырабленай прадпрыемствам прадукцыі застаецца на рынку Беларусі: палова рэалізоўваецца праз аптэчную сетку, астатняе — праз дзяржзакупкі для шпітальнага сегмента.



Як адзначыў **генеральны дырэктар РУП «Белмедпрэпараты» Аляксандр ЖАДАН,** штогод прадпрыемства асвойвае вытворчасць і выпускае каля 10 новых лекавых прэпаратаў. На прадпрыемстве ўдзяляецца вялікая ўвага развіццю новых кірункаў, інавацыям, кантролю якасці прадукцыі. Сёння лекі выпускаюцца на пяці вытворчых пляцоўках: дзвюх буйных у Мінску, а таксама ў Лідзе, Скідзелі, Бешанковічах.

## Якасць пачынаецца з упакоўкі

Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў спецыялізуецца на выпуску стэрыльных інфузійных раствораў. Яны выкарыстоўваюцца як самастойна, так і ў якасці носьбітаў іншых лекавых сродкаў, якія трэба ўвесці непасрэдна ў крывяносную сістэму.

Цяпер у асартыментным партфелі прадпрыемства 36 найменняў прэпаратаў. З улікам дазіровак і формаў выпуску вырабляецца каля 100 відаў прадукцыі. У асноўным яна прызначана для шпітальнага сектара, гэта значыць, выкарыстоўваецца ў бальніцах. Невялікая частка прадукцыі паступае ў аптэкі.

Як адзначыў **дырэктар ААТ Нясвіжскі завод медыцынскіх прэпаратаў» Генадзь ЖЫВЕНЬ,** 70 працэнтаў прадукцыі прадпрыемства каштуе да 2 рублёў, яшчэ 14,6 працэнта — ад 2 да 3 рублёў.

— Мы перайшлі на першасную ўпакоўку амаль на 100 % айчыннай вытворчасці. Гумавы корак атрымліваем з Кітая, нашы кітайскія калегі даволі нядрэнна з намі супрацоўнічаюць, — падзяліўся Генадзь Жывень. — Да першаснай упакоўкі прад'яўляюцца вельмі высокія патрабаванні. Яна павінна быць інертная. Гэта значыць, ніякага ўплыву на раствор. Пры ўзаемадзеянні з першаснай упакоўкай не павінна быць ніякай рэакцыі, таму патрабаванні да вытворцаў вельмі высокія.

Завод закупіў лінію па поўным цыкле вытворчасці ўпакоўкі — бутэлек, мяккіх палімерных пакетаў. Увогуле, прадпрыемства пастаянна мадэрнізуецца. Апошнім часам пабудаваны склад сыравіны і матэрыялаў, які адпавядае ўсім сучасным патрабаванням, новая мікрабіялагічная лабараторыя, цалкам мадэрнізавана хімічная лабараторыя. У стадыі завяршэння будаўніцтва біялагічнай лабараторыі, якую плануецца здаць сёлета. Вялікую ўвагу тут удзяляюць якасці прадукцыі і яе кантролю.

## Уласныя распрацоўкі для лячэння пухлін

Прадпрыемства «Акадэмфарм» створана з мэтай забяспечыць беларусаў высакаякаснымі прэпаратамі — аналагамі прэпаратаў сусветнай фармацэўтычнай прамысловасці. Сёння яно выпускае 45 прэпаратаў, прычым забяспечвае не толькі рынак нашай краіны, але і нарошчвае экспартныя пастаўкі ў Расію. Некалькі прэпаратаў з'яўляюцца арыгінальнымі і створаны сумесна з калегамі з Інстытута біяарганічнай хіміі НАН. Яны вырабляюцца ў Беларусі па поўным цыкле. На прадпрыемстве рэалізоўваецца два вялікія інавацыйныя праекты. У прыватнасці, будуецца новы цэх, дзе плануюць выпускаць больш чым 35 новых прэпаратаў.

На выпуску анкагематалагічных прэпаратаў спецыялізуецца прадпрыемства «ХімФармСінтэз». Калісьці тут пачыналі з вытворчасці субстанцый, цяпер перайшлі на выпуск гатовых лекавых форм. Фармвытворца мае тры пляцоўкі, першая з якіх выпускае фармацэўтычныя субстанцыі, другая — ін'екцыйныя растворы, трэцяя — цвёрдыя лекавыя формы ў выглядзе капсул і таблетак.

— Летась зарэгістраваны два новыя таргетныя прэпараты для лячэння нырак і страмальных пухлін. Іх інавацыйнасць у тым, што нягледзячы на тое, што яны ўзнаўляюць малекулы вядомых брэндаў, тэхналогія атрымання субстанцый і атрыманне гатовых лекавых форм — нашы ўласныя распрацоўкі, — расказала **намеснік дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце — начальнік НПЦ «ХімФармСінтэз» Алена КАЛІНІЧЭНКА,** дадаўшы, што каля 50 % прадукцыі пастаўляецца на рынак Расіі, а само прадпрыемства ўваходзіць у топ-10 вытворцаў, якія працуюць на экспарт.

**Алена КРАВЕЦ.**